ДУК “Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Труса”
Дзіцяча-юнацкі аддзел

# Праект

# “Лялечны тэатр “Каласавічок””



Узда 2026

**Актуальнасць:**

Тэатр садзейнічае ўсебаковаму развіццю асобы дзіцяці, яго непаўторнай індывідуальнасці. Сучаснае паўнацэннае валоданне мовою з’яўляецца першай важнейшай умовай станаўлення ў дзіцяці паўнацэннай псіхікі і далейшага правільнага яе развіцця. Тэатралізаваныя пастаноўкі дапамагаюць вырашаць многія актуальныя праблемы ў выхаванні дашкольніка і малодшага школьніка: фарміруюць правільны эстэтычны густ; развіваюць камунікатыўныя здольнасці; аказваюць уплыў на развіццё мовы, памяці, увагі, уяўлення; дапамагаюць вырашаць канфлікт у працэсе гульні; ствараюць станоўчы эмацыянальны настрй; дапамагаюць маральнаму выхаванню.

Дзіцячая бібліятэка – найбольш адкрыты сацыяльны інстытут, які прадстаўляе доступ да культурных каштоўнасцей, месца для зносін, правядзення вольнага часу, асяроддзе для самаразвіцця інтэлекта, пазнання свету і вызначэння свайго месца ў ім.

Бібліятэка – Лялькі – Кніга – цудоўная садружнасць, здольная прыносць плён у галіне развіцця чытацкіх здольнасцей дзяцей. Так, гэта крапатлівая праца, якая патрабуе шмат часу, цярпення, але і самы, напэўна, кароткі шлях да сэрца дзіцяці. З дапамогаю лялек можна больш эмацыянальна, даступна расказаць пра творчасць пісьменніка, раскрыць сутнасць яго твора, рэкамендаваць кнігі. Інсцэніроўка літаратурных твораў дапамагае ператварыць мерапрыемства і працэс чытання ў больш яскравы і святочны занятак.

Для маленькіх чытачоў лялечны тэатр – не толькі казка, у якой можна адчуць сябе шчаслівым, але і добры дарадца, настаўнік, сябар, які дапамагае адчуць упэўненасць у сваіх сілах, вынайсці сваё “Я”. Сам ход тэатралізаванага дзейства заварожвае, прываблівае, прымушае па-новаму ўбачыць даўно знаёмыя з’явы.

**Мэта праекта:**

Далучэнне маленькіх чытачоў да крыніц тэатральнага мастацтва, стварэнне ўмоў для фарміравання маральна-эстэтычнага, выхаваўчага асяроддзя для чытачоў і наведвальнікаў бібліятэкі.

**Задачы праекта:**

1. Прыцягненне маленькіх чытачоў у бібліятэку.
2. Максімальнае раскрыццё фондаў і прадвіжэнне кнігі.
3. Прывіццё любові дзяцей да кнігі, чытання, агульначалавечых каштоўнасцей.
4. Пашырэнне кола зацікаўленасці дзяцей, развіццё іх уяўлення, фантазіі, творчых здольнасцей.
5. Папулярызацыя сямейнага чытання.

**Арганізатар праекта:**
ДУК "Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэкі імя П. Труса",
дзіцяча-юнацкі аддзел

**Мэтавая аудыторыя праекта:**
Дашкольнікі
Дзеці малодшага школьнага ўзросту

**Перыяд рэалізацыі праекта:**
З 1 студзеня 2026 года да 31 студзеня 2026 года

**Супрацоўніцтва:**
ДУА "Дзіцячы сад №3 г. Узда"
ДУА "Дашкольны цэнтр развіцця дзіцяці "Вясёлка" г. Узда"
ДУА "Узденская раённая гімназія"
ДУА "Уздзенская сярэдняя школа №2 імя К. Крапівы"
ДУА "Уздзенская сярэдняя школа №1 імя А.С. Пушкіна"

**Прагназуемыя вынікі:**

Праект разлічаны на перспектыўнае развіццё дзейнасці біблітэкараў у стварэнні творчай тэатральнай прасторы, што дапаможа традыцыйныя бібліятэчныя мерапрыемствы зрабіць інавацыйнымі, больш разнастайнымі і цікавымі.

**Кіраўнік праекта:** Кірэева Г.М.

**Змест работы на 2026 год**

| № п/п | Форма выканання | Змест работы | Тэрмін выканання |
|---|---|---|---|
| 1 | Тэатр ценяў | «Сказка о глупом мышонке» | I кв. |
| 2 | Тэатральнае падарожжа | «За горами, за лесами, за широкими морями» | I кв. |
| 3 | Кукальны спектакль | «Как петушок друзей искал» | IV кв. |
| 4 | Арт-гадзіна | «Театр + книга» | IV кв. |